*А. А. Акушэвіч (Мінск)*

# СТРАТЭГІІ ВЫКАРЫСТАННЯ НЕЙРОННЫХ СЕТАК ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ФІЛАЛАГІЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

***Анатацыя.*** *У артыкуле вылучаюцца 10 асноўных стратэгій выкарыстання нейронных сетак пры выкладанні філалагічных дысцыплін. Дадзеныя стратэгіі могуць прымяняцца пры планаванні метадычнай работы са студэнтамі педагагічных спецыяльнасцей і настаўнікамі.*

***Ключавыя словы:*** *нейронныя сеткі; філалогія; адукацыя; метадычная работа; стратэгія.*

***Abstract.*** *The article highlights 10 main strategies for using neural networks in teaching philological disciplines. These strategies can be used when planning methodical work with students of pedagogical specialties and teachers.*

***Keywords****: neural networks; philology; education; methodological work; strategy.*

Імклівае развіццё нейронных сетак стала заўважна ўплываць на шматлікія аспекты дзейнасці чалавецтства. Цікавасць да дадзенага напрамку сучасных тэхналогій назіраецца з боку вучняў, студэнтаў, выкладчыкаў, вучоных і шматлікіх прадстаўнікоў грамадскасці, што можна ўбачыць і ў разнастайных публікацыях па тэме, напрыклад: [1; 2; 3; 4] і інш. З аднаго боку, нейрасеткі прапаноўнаваюць выдатныя магчымасці і перспектывы, якія раней былі недасяжнымі і ў нейкай ступені фантастычнымі, а з іншага – ствараюць новыя тэарэтычныя і практычныя праблемы для сферы адукацыі на ўсіх яе ўзроўнях. У сувязі з гэтым важна акрэсліць асноўныя стратэгіі выкарыстання нейронных сетак у працэсе выкладання філалагічных дысцыплін. Вылучэнне дадзеных стратэгій неабходна для навукова абгрунтаванай арганізацыі павышэння кваліфікацыі настаўнікаў і ўдасканалення падрыхоўкі сучасных студэнтаў, якія навучаюцца на педагагічных спецыяльнасцях.

Аналіз паказвае, што сёння можна гаварыць як мінімум пра 10 стратэгій выкарыстання нейронных сетак пры выкладанні філалагічных дысцыплін.

***1. Ігнараванне.***

*Сутнасць стратэгіі*: падчас навучання не заўважаюцца і не выкарыстоўваюцца нейрасеткі; аддаецца перавага толькі праверанным (“традыцыйным”, “звыклым”, “зразумелым”) методыкам і тэхналогіям.

*Заўвага.* Нейрасеткі – гэта дастаткова новая з’ява, якая можа быць ацэнена як пэўная мода, таму ўстановы адукацыю могуць чакаць, пакуль новаўвядзенне дакажа сваю мэтазгоднасць. Да таго ж, нейрасеткі патрабуюць фінансавых выдаткаў. Гэтай стратэгіяй не прадугледжваюцца пакаранні за ўзаемадзеянне са штучным інтэлектам.

***2. Забарона.***

*Сутнасць стратэгіі*: з мэтай фарміравання неабходных кампетэнцый падчас

навучання забараняецца любое прымяненне нейронных сетак.

*Заўвага.* Забарона выкарыстання нейрасетак фіксуецца ў нарматыўных дакументах, прапісваюцца наступствы. Дадзеная стратэгія сыходзіць з таго, што нейрасеткі – негатыўная з’ява, якая стымулюе махлярства, перашкаджае чалавеку развіваць уласныя навыкі і ўменні і стварае ўмовы для свядомага ці несвядомага перакладвання адказнасці на камп’ютарныя тэхналогіі.

***3. Несістэмнае прымяненне.***

*Сутнасць стратэгіі*: па жаданні вучняў (студэнтаў) і/ці настаўнікаў (выкладчыкаў) дапускаецца, але не патрабуецца прымяненне нейрасетак у адукацыйным працэсе, якое носіць несістэмны характар.

*Заўвага.* Асобныя педагогі-наватары могуць звяртацца да тэматыкі выкарыстання нейрасетак у адукацыі і трансліраваць свой перадавы вопыт. Аднак навучанне рабоце з нейрасеткамі будзе залежыць ад жадання, здольнасцей і магчымасцей асобных настаўнікаў і вучняў.

***4. Навучанне вучняў (студэнтаў) рабоце з нейрасеткамі.***

*Сутнасць стратэгіі*: акцэнтуецца ўвага на развіцці ўменняў вучняў (студэнтаў) працаваць з нейрасеткамі ў межах філалагічных дысцыплін.

*Заўвага.* Адным з вынікаў навучання будзе падрыхтаванасць вучняў (студэнтаў) да выкарыстання нейрасетак падчас вучобы і працы.

***5. Навучанне настаўнікаў (выкладчыкаў) рабоце з нейрасеткамі.***

*Сутнасць стратэгіі*: акцэнтуецца ўвага на развіцці ўменняў настаўнікаў (выкладчыкаў) працаваць з нейрасеткамі ў межах філалагічных дысцыплін, сваёй прафесійнай дзейнасці.

*Заўвага.* Выкарыстанне нейрасетак зможа дапамагчы педагогам выконваць свае абавязкі хутчэй і эфектыўней. Пры гэтым вучні (студэнты) не абавязкова будуць кантактаваць з нейрасеткамі непасрэдна.

***6. Уключэнне работы з нейрасеткамі ў вучэбныя праграмы асобных вучэбных дысцыплін.***

*Сутнасць стратэгіі*: праца з нейрасеткамі закладваецца ў вучэбныя праграмы асобных філалагічных дысцыплін як абавязковая кампетэнцыя.

*Заўвага.* Праз асобныя практыкаванні і раздзелы вучэбных дапаможнікаў у межах спецыяльна адабраных (“традыцыйных”) дысцыплін мяркуецца ажыццяўленне навучання рабоце з нейрасеткамі.

***7. Распрацоўка спецыяльных вучэбных дысцыплін па рабоце з нейрасеткамі.***

*Сутнасць стратэгіі*: увядзенне абавязковай дысцыпліны “Нейронныя сеткі” (або некалькіх дысцыплін па дадзенай тэме) для ўсіх навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі.

***8. Навучанне рабоце з нейрасеткамі як дадатковая адукацыя.***

*Сутнасць стратэгіі*: правядзенне навучання рабоце з нейроннымі сеткамі ва ўстановах дадатковай адукацыі, на дадатковых занятках, па-за межамі асноўных вучэбных заняткаў.

***9. Перабудова ўсёй сістэмы адукацыі.***

*Сутнасць стратэгіі*: прызнанне работы з нейрасеткамі адной з ключавых

кампетэнцый сучаснага выпускніка і рэзкая змена падыходаў і патрабаванняў да вучэбнага працэсу і яго вынікаў на ўсіх узроўнях.

***10. Сістэмнае ўкараненне нейрасетак у адукацыйны працэс.***

*Сутнасць стратэгіі*: паступовае ўкараненне ў адукацыйны працэс сістэмнага выкарыстання нейрасетак як часткі штодзённага жыцця.

Такім чынам, коратка акрэслены 10 асноўных стратэгій выкарыстання нейронных сетак пры выкладанні філалагічных дысцыплін. Кожная стратэгія мае свае плюсы і мінусы. Розныя канкрэтныя сітуацыі ці педагагічныя праблемы могуць патрабаваць звароту да розных стратэгій. На практыцы можа назірацца змяшэнне статэгій.

***Літаратура***


1. Богатова, С. М. Дидактические возможности нейросетей в обучении иностранным языкам / С. М. Богатова, О. В. Фрезе // Современное педагогическое образование. – 2024. – № 3. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/didakticheskie-vozmozhnosti-neyrosetey-v-obuchenii-inostrannym-yazykam. – Дата доступа: 16.06.2024.
2. Искусственный интеллект в образовании: перспективы и примеры использования // https://foxford.ru. – Режим доступа: https://media.foxford.ru/articles/neyroseti-v-obrazovanii. – Дата доступа: 22.06.2024.
3. Как применять ChatGPT и его аналоги в образовании: большой обзор от экспертов // https://skillbox.ru. – Режим доступа: https://skillbox.ru/media/education/kak-primenyat-chatgpt-i-ego-analogi-v-obrazovanii-bolshoy-obzor-ot-ekspertov/. – Дата доступа: 23.01.2024.
4. Филатова, О. Н. Применение нейросетей в профессиональном образовании / О. Н. Филатова, М. Н. Булаева, А. В. Гущин // Проблемы современного педагогического образования. – 2022. – № 77-3. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/primenenie-neyrosetey-v-professionalnom-obrazovanii. – Дата доступа: 23.01.2024.